Бялыніцкая
Краязнаўчая газета
ДАЎНІНА
№ 6 (28)
Чэрвень
2009

# Стан мясцовай прамысловасці Бялыніцкага раёна на мяжы 19-20 стагоддзяў

Прамысловасць рэгіёна была заснавана на мясцовай сыравіне. Напрыклад, існаваў шэрага прадпрыемстваў па вырабе таннага сукна – сукнавальні. Яшчэ ў сярэдзіне 19 ст. сукнавальні дзейнічалі ў Сярмяжанцы, Вугольшчыне, Нежкаве, Вялікай Машчаніцы, Забалацці, Рудні, Бялынічах.

Працавала некалькі дзегцярных заводаў – у Ключыках, Гуце, Рафалаве, Рубяжы. Шкіпінарнае прадпрыемства з 1878 г. існавала ў вёсцы Аксенькавічы. Дзягцярна-шкіпінарны завод дзейнічаў у Цяхціне. Дзягцярна-шкіпінарныя заводы ў вёсцы Забалоцце Царковішчанскай воласці належалі Лейбе Фельзеру, у вёсцы Цяхцін – Мордуху Фрыдлянду і Шлему Гурбе, заврд у вёсцы Лапары Нежкаўскай воласці – Іллю Сарокіну. Прыватнаўласніцкімі былі смалакурні ў вёсках Буда, Забалоцце, Рафалаў, Цяхцін.

У 1897 г. эсьмонскія мяшчане Ш. Эдэль, М. Рабіновіч і Л. Фельдман заснавалі ў мястэчку фабрыку па выпуску драўляных калодак для абутку пад назвай “Лер”, якая потым стала называцца таварыствам “Вослійка” (па назве ракі). Па звестках на 1900 г. фабрыка выпусціла прадукцыі на 7200 руб. Працавала на ёй 13 рабочых. Прадпрыемства мела паравы рухавік магутнасцю 17 конскіх сіл. У 1904 г. колькасць рабочых павялічылася да 23. Сярод іх было 8 жанчын.

У 1880 г. С. Мясаедаў пабудаваў у Бялынічах цагельню, якую здаў у арэнду мешчаніну Гельману. Чатыры яе рабочых вырабілі ў 1894 г. 18 тысяч цаглін, на 800 руб. Цагельнае прадпрыемства працавала і ў вёсцы Царковішча (Акцябрына).

У Бялынічах знаходзілася яшчэ некалькі прадпрыемстваў, у прыватнасці бровар і піваварня. Апошняя дзейнічала з1855 г. Яе арандатар Шыфрын наймаў аднаго рабочага, які выпускаў у год да 900 вёдзер піва (1 вядро = 12,29 л) на суму звыш 500 руб. У 90-я гады 19 ст. піваварня перастала існаваць, а дзейнічаў толькі бровар, пабудаваны ў 1874 г. С. Мясаедавым. У 1898 г. ён быў капітальна перабудаваны. Будынак завода стаў трохпавярховым, тут меўся паравы рухавік у 15 конскіх сіл. Побач стаяў дом, дзе жылі рабочыя. У 1911 г. бровар перайшоў да Т. Фермор (Мясаедавай).

Другі бровар, крыху меншы, з 1892 гю працаваў у маёнтку Гуры каля Галоўчына і належаў М. Васілеўскай.

Выраблены на броварах спірт ішоў на продаж у бліжэйшыя гарады, а таксама ў расійскія буйныя цэнтры, у Прыбалтыку і за мяжу. Значная яго частка паступала ў мясцовыя корчмы.



**Касцёл у Свяцілавічах. Пачатак 20-га стагоддзя.**

Бульба, якая была асноўным прадуктам для вінакурэння, перараблялася і на крухмал. Такое прадпрыемства ў 1880 г. узнікла ў маёнтку памешчыка С. Вэнцэловіча Высокае Нежкаўскай воласці.

З харчовых прадпрыемстваў дзейнічалі яшчэ 6 крупадзёрак, тры з іх знаходзіліся ў Бялынічах, па адной у Вялікім Нежкаве, Красным і Малым Кудзіне. Пабудаваныя ў 60 – 70 гг. 19 ст., яны мелі па адным рабочым іў год маглі выдаваць да 150 чвэрцяў круп (чвэрць = 141,28 кг). Усе яны працавалі ў комплексе з вадзянымі альбо ветранымі млынамі і прыводзіліся ў дзеянне адным рухавіком, што было

*(Заканчэнне на ст. 2)*

# Стан мясцовай прамысловасці Бялыніцкага раёна на мяжы 19-20 стагоддзяў

*(Заканчэн. Пач. на ст. 1)*

эканамічна больш выгадна. Па гэтай жа прычыне разам з млынамі дзейнічалі і ўсе вышэйназваныя сукнавальні.

Усяго на тэрыторыі бялыніцкага краю на канец 19 ст. працавала 19 млыноў, з іх 15 вадзяных ( у Бялынічах, Эсьмонах, Падзевічах, Карытніцы, Кулакоўцы, Хватаўцы, Дзявошыцах, Вялікай Машчаніцы, Гуце, Сярмяжанцы, Вялікім Нежкаве, Рудні, Вугольшчыне і два ў Жорнаўцы) і 4 ветраныя – у Вялікім Трылесіне, фальварках Кудзіне і Свяцілавічах, ваколіцы Мяжонка. У пачатку 20 ст. млыны з'явіліся ў Галоўчыне, фальварках Булаты, Высокае, вёсках Васількі, Забалоцце, Прыхабы, Запакулле. Маюцца звесткі пра адзін паравы млын. Ён знаходзіўся ў вёсцы Заазер'е і меў паравы кацёл і два жарнавыя паставы.

Наяўнасць рэк давала магчымасць выкарыстоўваць энергію вады, якая, у параўнанні з энергіяй ветру, была больш пастаяннай. Таму на рэках Друці, Вабічы, Восліўцы, Малушы і іншых будаваліся плаціны і ставілася асноўная колькасць млыноў. Большасць з іх мела два паставы для адначасовага перамолу жыта і ячменю.

З іншых вытворчасцей трэба зазначыць два прадпрыемствы ў вёсцы Задруцкая Слабада па падрыхтоўцы авечай воўны да прамысловага выкарыстання – часальні. Прадукцыя іх ішла на суконныя фабрыкі.

Рост мясцовай прамысловасці патрабаваў збыту розных тавараў перш за ўсё на ўнутраным рынку. Рос таксама і попыт на прамысловыя вырабы. Для гэтага ў мястэчках і вёсках праводзіліся базары, кірмашы, таржкі.

***Анатоль Марозаў, "Зямля Бялыніцкая"***

# Архимандрит Полиевкт

Уроженец Могилёвской епархии, сын священника, в мире носил имя Павла Пясковского. По окончании курса наук в Могилёвской духовной семинарии в 1843 году он стал готовиться к священству и через год рукоположен был во священника к Петро-Павловской церкви, местечка Словень, в то время Копысского уезда, 1844г. марта 4 дня. В 1847г. овдовев, по прошению поступил в число братии Могилёвского архиерейского дома, где и пострижен в монашество 23 декабря того же года 1848г. 28 июля определён экономом Могилёвского архиерейского дома. По прошению перемещён в Мстиславский Тупичевский монастырь 1848г. 27 сентября. По прошению поступил для продолжения образования в С.-Петербургскую духовную академию в 1849г, где и блестяще окончил по первому разряду в 1853г. магистром. В том же году 29 октября определён был смотрителем Велико-Луцкого духовного уездного училища и через три года утверждён в степени магистра богословия (12 мая 1856). Определён настоятелем Велико-Луцкого Троицкого третьеклассного монастыря 1854г. 5 января. За усердное попечение о благоустройстве монастыря награждён набедренником 1855г. 15 ноября. Определён членом местного духовенства 10 ноября.

Переведён вместе с братиею в новоотрытый Белыничский Богородицкий монастырь 1877г. марта 2 дня.

Архимандрит Полиевкт управлял Белыничским монастырём с начала открытия его в 1877 году до конца 1880 года, а потом по его прошению, переведён на настоя-



тельскую должность благочестием и обходительностью в обращении с людьми.

Архимандрит Полиевкт был замечательный проповедник Слова Божия, он оставил по себе добрую память в местечке своим благочестием и обходительностью в обращении с людьми. Скончался 7 апреля 1906 года, прослужив Церкви Божией свыше 62 лет.

*Святыні*

# Гімн абразу

Гісторыя абраза Бялыніцкай Боскай Маці знітавана з касцёлам і кляштарам кармелітаў, які заснаваў у 1622 годзе Леў Сапега. Неўзабаве касцёл становіцца цэнтрам рэлігійнага жыцця, галоўным чынам – дзякуючы цудатворнаму абразу.

Пра яго паходжанне існуе тнекалькі паданняў. Праваслаўныя сцвярджаюць, што яго прывезлі з сабой, ратуючыся ад татара-манголаў, манахі Кіеўска-Пячорскай Лаўры. Каталікі настойваюць на цудадзейным з’яўленні, а маляваў яго нібыта сам Анёл.

13 красавіка 1756 года Віленскі біскуп Зянкевіч атрымлівае праз папскага нунцыя каранацыйную булу на абраз Бялыніцкай Боскай Маці. Праз пяць гадоў 20 кастрычніка, па заваршэнні будаўніцтва новага касцёла ў Бялынічах, адбылося ўрачыстае ўскладанне кароны на абраз.

Пасля задушэння нацыянальна-вызвольнага паўстання ў 1832 годзе па загаду расейскага цара ліквідоўваецца Бялыніцкі кармялітскі кляштар. Неўзабаве (таксама пасля задушэння паўстання 1863 года) праваслаўная царква прадаўжае актыўнае змаганне і за касцёл. Перадача яго праваслаўным (пасля 44-гадовага супрацьстаяння канфесій) адбылася ў ноч з 11 на 12 красавіка 1876 года.

У гонар цудадзейнага абраза складаліся гімны, вершы, легенды. Праўда, далёка не ўсе яны здолелі захавацца, прабіцца праз смугу часу.

У гісторыі беларускай літаратуры досыць шырокую вядомасць мае “Гімн да абраза цудоўнай Маткі Боскай Бялыніцкай над Дняпром”, які, паводле меркавання многіх даследчыкаў, належыць пяру пачынальніка нацыянальнай літаратуры і актыўнага ўдзельніка нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863 года Арцёма Вярыгі-Дарэўскага.



**Абраз Маці Божай Бялыніцкай**

*Бялыніцкая наша Маці!*
*Мы дзетак тваіх грамада,*
*Молім: памож нам дыхаці!*
*Трудненька ж нам, а жыць нада!*
*Растапыр святыя ручкі*
*Над Дняпром і над Дзвіною!*
*Гэта ж хатак бедных кучкі*
*Набіты тваёю сям’ёю.*
*Распутай ты сцежкі нашы,*
*Мы ж камень у грудзях носім,*
*Мы ж не просім сала, кашы –*
*Толькі доленькі просім.*
*Зорынька! Воч тваіх сіла*
*Няхай азарыць свет цэлы!*
*Ты ж бацькоў нашых любіла,*
*Любі ж і нас – іх цвет няспелы!*
*Матулечка, як бывала,*
*І цяпер прытуль нас гэтак!*
*Сілкі ж ужо нам не стала.*
*Соўнінька! Глянь жэ на дзетак.*

## Бялыніцкі манастыр Раства Багародзіцы

Існаваў у мясэчку Бялынічы ў 1877-1918.Утвораны замест зачыненага ў 1877 Мсціслаўскага мужчынскага манастыра. Размяшчаўся ў будынках былога кляштара кармелітаў. Колькасць манахаў дасягала 40 чалавек ( пач. 20 ст.). Да Бялыніцкага манастара быў прыпісаны і пазаштатны Мсціслаўскі Тупічаўскі манастыр. У храме захоўваўся цудатворны абраз Маці Боскай, які застаўся ад кармелітаў.



**Бялыніцкі манастыр Раства Багародзіцы**



*Традыцыі нашага краю*

# Вяселле па-Гняздзінску

Вясельны цыкл пачынаецца са сватання, ці па-іншаму – запоінаў. Жаніх, узяўшы з сабой сяброў, сваякоў, едзе ў дом да нявесты. Вязуць з сабой гарэлку, хлеб, соль. Нявеста павінна паставіць на стол шклянкі: калі дном уверх – значыць, адмаўляецца пайсці замуж. Калі паднесеную жаніхом чарку яна выпівае – згодна пабрацца шлюбам з гэтым хлопцам. У гэтым выпадку праз тыдзень пасля запоінаў жаніх з блізкімі сваякамі выпраўляецца ў дагаворы, мэта якіх – абмеркаванне арганізацыі будучага вяселля.

Раней гуляць вяселле пачыналі ў нядзелю з выкупу нявесты, якую хавалі ад жаніха. Выкупляць яе – абавязак шафера. Плата – гарэлка, цукеркі альбо грошы.

Першы дзень вяселля спраўляўся ў хаце нявесты. Пасля застолля жаніху трэба было выкупіць пасцель нявесты, паколькі першая шлюбная ноч павінна адбыцца на ёй. Начаваць маладыя адпраўляліся ў хату бацькоў жаніха.

Надораныя грошы ў той дзень не пералічваліся.

Раніцой нявеста павінна была падмесці падлогу ў хаце жаніха. Калі яна праспала, то выплочвае грошы таму, хто гэта зрабіў за яе.

Свякруха навязвае нявестцы касынку і фартух.

Той жа самай раніцою жаніх выпраўляецца ў госці да цешчы. З сабой бярэ некалькіх чалавек, якія называюцца чалабітнікамі.

Цешча частуе жаніха яешняй, за якую павінен заплаціць грошы. Пасля снедання жаніх запрашае цешчу ў госці. А тая павінна адказаць, што не мае ботаў. Тут жа хтосьці перапранаецца ў абутніка і разыгрывае сцэнку, прапаноўваючы жаніху купіць боты. У рэшце рэшт жаніх дае грошы на абутак, а бацькі маладой, узяўшы пасаг, едуць у хату да жаніха.

Там іх сустракае нявеста, свякруха і госці жаніха. Павітаўшыся, яны сядаюць за стол. Перад гэтым жаніх павінен выкупіць пасаг.

Пачынаецца гулянне.

На трэці дзень гасцей склікае да сябе ў двор цешча. Вяселле працягваецца.

У першы год пасля вяселля цешча запрашае маладых і гасцей да сябе на пачастунак на Новы год.

На другі год яна таксама збірае гасцей, сям'ю зяця і частуе іх у першы дзень Каляды.

На трэцці год – на Хрышчэнне.

# Бялыніцкі раён у першай палове 18 стагоддзя

У канцы XVII - пачатку XVIII стагоддзя беларускія землі зноў зведалі ваеннае спусташэнне, на гэты раз у сувязі з вайной паміж Расіяй і Швецыяй, у якой на бяду для сябе прымала ўдзел Рэч Паспалітая. Неаднаразова войскі расійскага цара Пятра І і шведскага караля Карла XII высвятлялі адносіны на тэрыторыі Беларусі. Адна з такіх бітваў адбылася ў 1708 г. ля Галоўчына. У ёй шведы нанеслі паражэнне рускаму войску пад кіраўніцтвам Рэпніна. Пад час бітвы Галоўчын быў спалены, і яго замак больш не аднаўляўся.

Да часоў Паўночнай вайны адносіцца другі падымны тарыф Аршанскага павета, які быў складзены ў 1703 г. У адрозненне ад тарыфа 1667 г., на гэты раз «дым» як адзінка вымярэння адпавядаў не аднаму, а некальквім дварам, прычым яго дакладнае значэнне пакуль не высветлена. Таму гэты дакумент дазваляе стварыць уяўленне толькі пра адносныя памёры маёнткаў. Буйнейшым з іх на тэрыторыі сучаснага раёна быў на той момант Галоўчын, належачы Дамініку Служцы. У ім значылась 262 умоўных дыма. Таму ж Служцы належала тады і Барысаўскае староства з агульнай колькасцю 340 дымоў, якое часткова ахоплівала тэрыторыю раёна. Апрача таго, сярод абшараў гэтага староства па-ранейшаму існавалі асобныя невялікія «дзяржавы»: Клеўка, належачая Дадзбогу Карынскаму (2 дыма), Эсьмоны, належачыя Каралю Агінскаму (6 дымоў) і Дзявошыцы ў пажыццёвым валоданні Мікалая Агінскага (2 дыма).

У маёнтку Цяцерын, уладальнікам якога ў тарыфе памылкова названы полацкі ваяводзіч Аляксандр Агінскі (ён памёр значна раней, у 1690 г.)

***(Працяг на ст. 5)***

# Бялыніцкі раён у першай палове 18 стагоддзя

(Працяг. Пач. на ст. 4)

было 50 дымоў, з якіх каля дзесятка прыпадалі на сучасны Бялыніцкі раён. Фактычна Цяцерын належаў, відаць, брату Аляксандра Марцыяну Агінскаму, але і ён памёр у тым жа 1703 годзе, пасля чаго адзіным сапдчыннікам зрабіўся трэці брат - Казімір Дамінік, пазнейшы ваявода троцкі, а ў канцы жыцця - віленскі. Як упаміналася вышэй, яму ж належаў і маёнтак Бялынічы (242 дыма), але на той момант ён быў у арэндзе ў Паўла Радзішэўскага. Асобна вызначаны ў тарыфе 11 дымоў, якія былі ўласнасцю бялыніцкай яўрэйскай школы на чале з Ізраэлям Моўшавічам. Бялыніцкаму кляштару кармелітаў належаў маёнтак Цехцін з 4 дымамі. Нарэшце, Карытніца з Прыборкамі ў памеры 2 дымоў знаходзіліся ва ўладанні ўдавы Аляксандра Макрыцкага, Альжбеты Зарніцкай.

Пэўную частку раёна на паўднёвым захадзе займала належачае падскарбію Бенедыкту Сапегу Любашанскае староства, са складу якога вылучылася Карытніца, але пра яго паселішчы на той час амаль звестак няма. Толькі ў геаграфічным паказальніку да актавых кніг Віленскага архіва, зробленым у XIX стагоддзі Іванам Спрогісам, ёсць звестка пра сяло Бахань, пажалаванае на ленным праве Станіславу Пішчале ў тым жа 1703 г. - верагодна, са складу гэтага староства. На жаль, актавая кніга, з якой Спрогіс узяў гэтую звестку, дасёння не збераглася.

У наступным тарыфе Аршанскага павета, датаваным 1743 г., Бахань выступае як уладанне Багдана Пішчалы. Апрача таго, у гэтым тарыфе з'яўляецца невялікі маёнтак Дручаны, які належаў Кулакоўскаму. Верагодна, ён таксама быў вылучаны з Любашанскага староства, хаця непасрэдных звестак пра гэта мы не знайшлі.

Галоўчынам на пачатку XVIII стагоддзя на закладным праве валодалі браты Юзэф і Дамінік Служкі. Першы з іх памёр у 1701 г., пасля чаго яго ўдава Тэрэза з Гасеўскіх выйшла за віленскага ваяводу Казіміра Яна Сапегу, якому перад смерцю ў 1708 г. завяшчала суму ў 240 тыс. злотых, запісаную ёй на Галоўчыне першым мужам. Дамінік Служка памёр у 1713 г. без нашчадкаў. Пасля гэтага яго долю маёнтка, напэўна, таксама перакупіў Казімір Ян Сапега. У 1719 г. ён аддаў у часовы заклад за 5 тыс злотых Францішку Куроўскаму фальваркі Смятанічы і Гавяды, належачыя да Галоўчына.

Пасля смерці віленскага ваяводы ў 1720 г. закладнае права на Галоўчын перайшло да яго сыноў Ежы Станіслава і Аляксандра Паўла Сапегаў. Аднак брат Тэрэзы Гасеўскай Багуслаў, дэкан віленскага каталіцкага біскупства, распачаў з пляменнікамі цяжбу за даўгі іх бацькі. У тым жа годзе яны быццам бы пагадзіліся саступіць яму закладнае права на Голоўчын за 40 тыс. злотых, аднак у завяшчанні Ежы Станіслава Сапегі, напісаным незадоўга да яго смерці ў 1732 г., прыгадваецца, што ён здолеў захаваць за сабой гэты маёнтак, які і перадае адзінаму сыну Антонію Казіміру. Апошні памёр у 1739 г., завяшчаўшы закладнае права на Галоўчын сыну свайго стрыечнага брата Казіміра, дзевяцігадоваму Аляксандру Міхалу Сапегу.

Суседнімі Княжыцамі пасля згасання роду князёў Галоўчынскіх валодалі іх нашчадкі па жаночай лініі - паны Пацы: спачатку Канстанцы Уладзіслаў (памёр у 1686 г.), потым яго сыны Міхал і Мікалай (памёрлі адпаведна ў 1724 і каля 1710), затым - сын апошняга Крыштоф (памёр у 1725) і ўнук Антоні Міхал. У 1752 г. Антоні Міхал Пац пажадаў сабраць у сваіх руках усю спадчыну роду Галоўчынскіх. Спярша ён беспаспяхова спрабаваў адсудзіць Галоўчын у Аляксандра Сапегі як адзіны нашчадак згаслага рода, але ўрэшце набыў ад яго толькі закладнае права на гэтае ўладанне.

Між тым спадчыннае права на Галоўчын, нагадаем, пасля смерці князя Яна Галоўчынскага і шлюбу яго ўдавы з прадстаўніком польскага магнацкага рода Патоцкіх перайшло да апошніх. У тым жа 1752 годзе Антоні Міхал Пац выкупіў у Антонія, Міхала, Францішка, Ежы і Станіслава Патоцкіх іх права за 50 тыс. злотых, зрабіўшыся такім чынам адзінам і паўнапраўным уласнікам Галоўчына, пасля чаго далучыў яго да Княжыц.

Маёнтак Бялынічы на пачатку XVIII стагоддзя знаходзіўся ў валоданні троцкага ваяводы Казіміра Дамініка Агінскага. У 1726 г. ён перапрадаў закладнае права на гэты маёнтак за 11 тыс. 220 бітых талераў Яну Казіміру Лендорфу, які перад смерцю завяшчаў гэтую суму жонцы Крысціне. У 1733 г. яна аднавіла

(Заканчэн. на ст. 6)

# Бялыніцкі раён у першай палове 18 стагоддзя

***(Заканч. Пач. на ст. 4-5)***

шлюб са стрыечным братам Казіміра Дамініка - віцебскім ваяводам Марцыянам Міхалам Агінскім. Праз гэты шлюб Бялынічы перайшлі да апошняга. У 1742 г. Марцыян саступіў сваё права на карысць сына Ігнацыя і яго жонкі Алены (якая, дарэчы, была дачкой усё таго ж Казіміра Дамініка і, такім чынам, траюраднай сястрой свайго мужа).

У тым жа 1742 г. згарэў Бялыніцкі кармеліцкі кляштар. Агінскія ўзяліся за яго аднаўленне, прычым на месцы старога драўлянага пабудавалі новы, мураваны, з вялікім касцёлам у гонар Ушэсця Маці Боскай. Будаўніцтва завяршылася ў 1761 г. Тады ж Алена Агінская, прыклаўшы вялікія намаганні, вярнула з Ляхавіч славутую цудатворную ікону, якая знаходзілася там з 1655 г. Вяртанне абраза было абстаўлена з вялікай пышнасцю, была арганізавана нават яго каранацыя. Гэтая рэклама зрабіла сваю справу, і весткі пра вяртанне цудатворнай іконы шырока разышліся па наваколлі, парадзіўшы сапраўдны рэлігійны ажыя- таж. У Бялынічы пачалося масавае паломніцтва вернікаў, у сувязі з чым мястэчка пачалі называць «рускай Чэнстаховай» (у польскім горадзе Чэнстахове таксама знаходзіўся цудатворны абраз - аб'ект экзальтаванага паломніцтва).

Тым часам сын Караля Станіслава Радзівіла - віленскі ваявода Міхаіл Казімір, па мянушцы Рыбанька, нечакана вырашыў усё ж з вялікім запазненнем выкарыстаць сваё права на выкуп Бялыніч з закладу. Ігнацыю і Алене Агінскім, якія ўклалі ў маёнтак вялікія грошы, зусім не спадабалася перспектыва пазбавіцца яго, атрымаўшы ўзамен закладную суму, якая за 70 з лішкам гадоў у значнай ступені страціла былую вартасць. Між тым паводле Статута 1588 г., які дзейнічаў у ВКЛ, трымальнік закладу не меў права адмовіцца ад выкупу і не ўзяць грошы. Больш таго, Радзівіл, каб пазбегнуць пярэчанняў наконт неадпаведнасці сумы ў старых і новых злотых, сабраў 106 тысяч у старой сярэбранай манеце другой паловы XVII стагоддзя.

Агінскія пачалі ліхаманкава шукаць выйсце, якое б дазволіла ім захаваць Бялынічы ў сваіх руках. Дзеля гэтага яны паспрабавалі даказаць, што маюць не толькі закладнае, але і спадчыннае права на маёнтак. Агінскія пачалі сцвярджаць, што быццам бы ўдава Крыштофа Сапегі Алена, якая ў 1670-я гады скупіла часткі Бялыніч у паноў Шэметаў, не выплаціла ім цалкам усю суму, у сувязі з чым яны часткова захавалі спадчыннае права, набытае паводле завяшчання Казіміра Льва Сапегі. Гэтыя рэшткі спадчыннага права нібыта былі падараваны Ігнацыю і Алене Агінскім Тэрэзай Шэмет, удавой аднаго з іх аддаленых нашчадкаў, у 1751 г. Для вернасці Ігнацы Агінскі ў 1761 г. нават заплаціў Ераніму і Леану Шэметам грошы, такім чынам яшчэ раз набываючы ў іх гэтае міфічнае права.

На гэтай падставе Агінскія адмовіліся ўзяць выкуп, які прапанаваў ім Радзівіл у тым жа 1761 г. Натуральна, такія хісткія аргументы яго не збянтэжылі, і Міхал Казімір Рыбанька звярнуўся ў Галоўны трыбунал. Агінскія выкарысталі звычайную ў такіх умовах тактыку - не з'явіліся на судовае паседжанне. Тым не менш вердыкт быў вынесены на карысць Радзівіла, і ў студзені 1762 г. у Бялынічы прыбыў судовы выканаўца Яцак Жыжэмскі, які павінен быў забяспечыць перадачу маёнтка новаму ўласніку. Аднак эканом Францішак Рабчыцкі папросту не пусціў яго ў маёнтак, а Жыжэмскі па мяккасці характара не здолеў настаяць на сваім.

Не дачакаўшыся заканчэння справы, Радзівіл Рыбанька ў 1762 г. памёр. Барацьбу за маёнтак працягнуў яго сын і пераемнік на пасадзе віленскага ваяводы Караль Станіслаў, вядомы па мянушцы «Пане Каханку». Ён таксама атрымаў у 1763 г. дэкрэт трыбунала на сваю карысць, аднак выкананню гэтага дэкрэта перашкодзіла барацьба магнацкіх груповак у Рэчы Паспалітай, у сувязі з якой Пане Каханку вымушаны быў у 1764 г. эмігрыраваць за мяжу, дзе правёў доўгія 12 гадоў. Пасада віленскага ваяводы дасталася тады 35-гадоваму Міхалу Казіміру Агінскаму, які быў уладальнікам Цяцерына пасля свайго дзеда Казіміра Дамініка (памёр у 1733) і бацькі Юзафа (памёр у 1736). Што да Ігнацыя Агінскага, то ён атрымаў крыху пазней, у 1768 г., другую па значэнні пасля віленскага ваяводы дзяржаўную пасаду - віленскага кашталяна.

***В. І. Насевіч***

WWW
http://ipcentr.org/

# Бялыніцкі раён пад час першай сусветнай вайны

Першая сусветная вайна непасрэдна не закранула наваколляў Бялыніч, фронт праходзіў далёка. Але ўзнікла шмат праблем, звязаных з вайной. Галоўная з іх была праблема бежанства.

Бежанцы з Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў, прыхапіўшы з сабой свае пажыткі, а многія і свойскую жывёлу, ішлі на ўсход. Значная частка з іх асяддала ў Магілёўскім павеце. Трэба было накарміць людзей, знайсці ім нейкі занятак. Для гэтага ўвялі пасаду ўпаўнаважанага па ўладкаванню бежанцаў Заходняга фронту Магілёўскага тылавога паўнамоцтва.

У Бялынічах і Галоўчыне стварылі харчовыя станы. Кожнай сям'і выдавалася кніжка на права атрымання харчавання і сухога пайку. Сухі паёк выдаваўся на тыдзень і складаўся з двух фунтаў хлеба (1 фунт = 409,5 г), фунта мяса, двух фунтаў бульбы, чвэрці фунта крупы, чатырох лотаў цукру (1 лот = 12,79 г), столькі ж солі і паўлота чаю на аднаго чалавека. Пры харчовых станах фарміраваліся сельскагаспадарчыя дружыны. Існаваў спецыяльны аддзел па іх арганізацыі і накіраванні на працу.

Вайна забрала на фронт амаль усё мужчынскае насельніцтва, таму не хапала працоўных рук. Да работ прыцягваліся ў абавязковым парадку ўсе здаровыя бежанцы ад 14 да 55 гадоў. У тых, хто ўхіляўся ад работ, адбіралі кніжкі на атрыманне прадуктаў харчавання.

Вельмі цяжка было з жыллём. Бежанцаў сялілі ва ўсе магчымыя на той час грамадскія будынкі: школы, бальніцы, валасныя ўпраўленні, пастаялыя двары. У Бялынічах, Высокім для іх пабудавалі баракі. Улетку бежанцы размяшчаліся пад адкрытым небам. Сярод іх ўспыхвалі эпідэміі брушнога і сыпнога тыфу, дызентырыі, коклюшу, многія паміралі.

Часта паміж мясцовымі жыхарамі і бежанцамі ўзнікалі непаразуменні. У валасцях стваралiся часовыя камісіі па вызначэнні памераў страт, нанесеных бежанцамі розным асобам. Восенню 1915 г. такія камісіі працавалі ў вёсках Шылавічы, маёнтку Бялынічы. Былі складзены акты аб памерах страт і іх пакрыцці.

Сялянская гаспадарка ў час вайны пацярпела ад перамяшчэння войск. Для патрэб арміі ў насельніцтва рэквізаваліся коні, фураж і нярэдка са злоўжываннямі. На месцы з прыцягненнем ваенных стваралiся ацэначныя камісіі.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі значна ўзняла актыўнасць сялянства. Сяляне самавольна высякалі панскі лес, травілі пашы і іншыя сельгасугоддзі. Гэтым рухам быў ахоплены і Магілёўскі павет.

Восьмы надзвычайны земскі сход Магілёўскага павета ў сакавіку 1917 г. зацвердзіў палажэнне аб валасных земскіх камітэтах. Яны выбіраліся ўсімі жыхарамі валасцей ад саслоўяў і веравызнанняў у разліку адзін дэпутат ад 300-500 чалавек. Валасныя камітэты разглядалі пытанні перадачы ў арэнду сялянам панскіх сенажацяў, скаргі памешчыкаў аб захопе сялянамі пашаў, пасеваў і іншых угоддзяў.

У час Лютаўскай рэвалюцыі



ў Бялынічах актывізавалі сваю дзейнасць яўрэйская партыя "Бунд" і чарнасоценцы з "Саюза рускага народа". З набліжэннем восені 1917 г. шырылася бальшавіцкая прапаганда.

***Анатоль Марозаў, "Зямля Бялыніцкая"***

<u>*Паданні нашага краю*</u>

## Асавец

Гэта здарылася вельмі даўно, калі не было яшчэ самой вёскі, а на месцы яе стаяў хутар. Належыў ён маладому і вельмі прыгожаму пану. А на панскай гаспадарцы працавала няпісанай прыгажосці дзяўчына Ася.

Малады паніч, якога звалі Вацлаў, і Ася пакахалі адзін аднаго. Ды бацькі Вацлава не дазволілі ім пажаніцца. І маладыя рашылі: лепей памерці разам, чым жыць не сумесна.

Аднойчы на світанні, калі сонейка толькі-толькі пачалоўзыходзіць, яны, узяўшыся за рукі, пайшлі няведама куды.

Болей іх аніхто аніразу не бачыў і нічога пра іх не чуў.

Мясцовыя людзі вельмі любілі іх, часта ўспаміналі пра іх нешчаслівую долю. Каб ушанаваць памяць пра закаханых, склалі разам іх імёны – Асавец – і далі найменне сваёй вёсцы.

# Гісторыя раёна. Чэрвень.

*-1878 (чэрвень). Пажар у вёсцы Пачапок, згарэлі 18 двароў.*

*-1889 (лета). Археолаг М. П. Авенарыус каля Эсьмонаў знаходзіць 120 каменных сякер.*

*-1896, 6 чэрвеня. Чарговы пажар у Бялынічах вынішчыў 106 дамоў.*

*-1913. Увёсцы Клява знойдзена 677 манет Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, паўталеры Іспанскіх Нідэрландаў, срэбныя і залатыя манеты Германскай імперыі. Схаваны ў 1661 годзе.*

*-1938, 25 чэрвеня. Нарадзіўся ( у Бялынічах) расейскі паэт І. І. Шклярэўскі.*

*-1941, чэрвень. Загадкавае знікненне абраза Бялыніцкай Маці Боскай, які знаходзіўся ў Магілёве. З гэтай даты лічыцца згубленым.*

*-1944, 29 чэрвеня. Вызваленне Бялынічаў ад нямецка–фашысцкіх акупантаў воінамі 42 Смаленскай стралковай дывізіі. 30 чэрвеня партызаны Бялыніцкай ваенна –аператыўнай групы злучыліся з воінамі 139 і 238 стралковых дывізій у 5 кіламетрах паўднева –усходней вёскі Белы Лог. Вызваленне раёна.*

*-1952. (чэрвень). Даследванне археолагам К. М.Палікарповічам былога возера Вейна каля вёскі Лубяны. Выяўлена палевае паселішча, 7 месцазнаходжанняў апрацаванага крэменю, керамікі эпохі неаліту і бронзы.*

*-1957, 18 чэрвеня. У Расіі памёр народны мастак Беларусі і РСФСР, акадэмік жывапісу Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі –Біруля.*

*-1963, 16 -19 чэрвеня. Палёт у космас на караблі “Усход -6” першай у свеце жанчыны – касманаўткі В. У. Церашковай, бацькі якой паходзілі з Бялыніцкага раёна.*

*-1993, 14 чэрвеня. Праходзяць Першыя раённыя краязнаўчыя чытанні. Запачаткаванне ў раёне краязнаўчага руху, паўстае ініцыятыўная група па стварэнні краязнаўчага таварыства.*

*Паданні нашага краю*

## Прыбарская крыніца

Жыў калісьці ў гэтай мясцовасці (паміж Цяхціном і Прыбарам) пан. І была ў таго пана дачка. Прыгожая і адзіная ў панскай сям’і. Ведама, бацька яе вельмі шкадаваў і шанаваў.

Усяму прыходзіць свій час. Пакахала панская дачка маладога хлопца. Бацьку дзяўчыны ён вельмі не спадабаўся. Забараніў пан строга ім сустракацца.

Але што для закаханых забарона?

Калі кахаеш, усе перашкоды адолееш.

Вось івырашылі яны ўцячы, каб жыць-пажываць разам.

Калі пан даведаўся пра іх змову, дачка ўжо ехала ў карэце са сваім каханым.

Бацька пракляў сваю дачку. І ў гэты самы момант, калі ён прамаўляў апошнія словы праклёну, зямля расступілася, і карэта пайшла пад зямлю.

На тым месцы ўтварылася крыніца: паміж вёскамі Цяхцін і Прыбар, каля лесу на лузе.

І колькі было непагадзі, засухі, але тая крыніца, як жывая, заўсёды б’е ключом.

## Васількі

Даўным-даўно жыў тут чалавек. Зваўся ён Васілём. Вельмі любіў Васіль кветкі, а таму і сам вырошчваў іх. Новым кветкам даваў імёны.

Аднойчы ў яго садзе з’явілася новая кветачка. Была яна блакітнага колеру. Яна ўмела размаўляць і пры першым спатканні папрасіла яго, каб ён хутчэй даў ёй імя . Прыгожае, мілагучнае.

Доўга-доўга думаў Васіль і нарэшце развважыў, што назвы лепшай заВасілёк не прыдумаць.

Васіль з Васільком многа чаго не дагаварылі. Але аб новай кветачцы, якая да таго ж умее гаварыць, даведаўся туташні злосны пан. Ён і загадаў Васілю прынесці кветку да яго ў святліцу.

Пра гэтае няшчасце дачуўся і Васілёк. Ён таксама не хацеў жыць у злоснага чалавека і ператварыўся ў чырвоную, нікім незаўважаную кветачку.

Азвярэлы пан люта пакараў Васіля, а напрыканцы мучэння загадаў укінуць яго цела ў рэчку. Так і загінуў Васіль, але кветачка – засталася. А людзі і перайменавалі сваё паселішча Васількамі – як памяць аб Васільку, Васілю і яго кветках.

Бялыніцкая даўніна

Кразнаўчая газета.Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў